Нотно-текстовые транскрипции Т. Л. Беркович

1. Ну-ну-ну, Казёл, ну-ну-ну, нябож («у козліка хадзілі», «на шчадрыца», расказ і спеў)

Зап. экспедиция БГАМ (рук. группы Т. Л. Беркович) в 2008 г. в д. Мерешино Слуцкого р-на Минской обл. от Жук Татьяны Алексеевны (1931, д. Крупеники Любанского р-на).

Опубликовано: Бярковіч Т. Песенна-гульнявыя дзеі перыяду сонцавароту ў этнамузычнай традыцыі беларусаў. Мінск, 2015. С. 115-117. № 22.

Ж.Т. Мы хадзілі як о дзяўчатамі былі, эта дзевачкамі былі, дак пад вокна ўжо хадзілі. Як жа ж эта бегалі пад окна, спявалі, нам ужо што-нібудзь і дадуць... А так *у козліка хадзілі*, дак эта там усё хлопцы хадзілі, а мы тока за механошэй хадзілі ззадзе. І ўжэ заходзім у хату, спяваем:



Па ўсяму сялу
пан-гаспадару
і гаспадыньца
прыкланіся нізка,
скланіся нізка.
Наша Козінька
спалахнулася,
ні ў тыя глаза
захавалася.



(смяецца) Каза ўжо ўстаецца – танцуе, што ўжэ кусок сала далі, калбасу далі, о. А дзеўчата ўжо пад во/укнамі спявають тожа:

Паслухай, мужу, што ў бару гудзе,
Пчолна матка йдзе, раёчкі ведзе,
Раёчкі ведзе, навучая.
Сьвяты вечар, добрым людзям!
Святы вечар, добрым людзям!

Эта пад во/укнамі мы спявалі ўжэ. Ўжэ нам выйдуць, што-небудзь дадуць, мы далей пашлі. А *козліка*-та папахадзілі мы, як малыя былі. Ну як ужо – ўзрослыя былі! Хлопцы спяваюць, і кажух вывярнуць, да зробяць ужо бараду, каб этак о ляпала. Мой бацька да зрабіў такую зь дзерава, тут бародку зрабіў, такой ходзіць, ляпае і танцуе, а ўсе *каляды* спяваюць. Вот. Да нажабруюць, да ўжо вечарам нагуля-яюць ужо. Там і калбасы дадуць, і сала, і ўсяка ўсячыны дадуць, дык ужо гуляюць, два дні гуляюць з тым ужо, што на *шчадрыца*.

Вот было што ўпярод, а цяпер этага німа. Ходзяць, ходзяць, гармошку возьме да балалайку, да прыйдут да па… пашлёпают, пашлёпают. «Што эта, – кажу, – за Казлы?» Дак я ко[жу]: «Дайце я вам паспяваю. Вот то *казёл*!» Так яны: «Ого! Так Вы умееце?» Я ка[жу]: «А чо вы не навучыцеся? Ды хадзілі б дый спявалі». А то прыш[лі]: «Я у бацькі адзін, – нек пачане гаварыць, – дак

мяне бацька паслаў, каб я кусок сала дастаў». Я ко[жу]: «Ого, што бацька цябе навучыў! Эта ні спесня». Да пастаяць у двары ці эта ў дзверах, о то да дай ім што-небудзь. То бывае што-небудзь ткнеш: «Ідзіце!»

2. Пастаі, дзядулячка, я твая бабулячка («Цярэшку жанілі», расказ і спеў)

Зап. Т. Л. Беркович в 1993 г. в д. Куропольe Поставского р-на Витебской обл. от Сидорович Валентины Петровны (1923, д. Лесково).

Опубликовано: Бярковіч Т. Песенна-гульнявыя дзеі перыяду сонцавароту ў этнамузычнай традыцыі беларусаў. Мінск, 2015. С. 151. № 61.

Т.Б. Раскажыце, Валянціна Пятроўна, як у вас каляды спраўлялі.

В.С. А пры мне ўжо так ні спраўлялі, як я была дзеўка. Гэта мама расказывала: маладая, яна як была дзеўка, дык *Цярэшку жанілі*.

Т.Б. Раскажыце, як жанілі Цярэшку.

В.С. Дык вот толька ж па расказу, так жа ж я ня відела. Ну неяк жа ж там станавіліся ў круг і ўжо хто й сь кім, і *дзед* і *баба* гэта ўжэ дабіраліся. І тады ловяць: *баба дзеда* ловіць, а *дзед – бабу*. І песню пяець *баба* ж ужо «Пастаі, дзядулячка, я твая бабулячка».

Т.Б. А Вы можаце спець яе?

В.С. (смяецца, спявае):



3. Сядзі, сядзі, Яшчар / Гей, на моры (карагод-гульня «Яшчар», расказ і спеў)

Зап. Т. Л. Беркович в 1993 г. в д. Курополье Поставского р-на Витебской обл. от Сидорович Валентины Петровны (1923, д. Лесково).

Опубликовано: Бярковіч Т. Песенна-гульнявыя дзеі перыяду сонцавароту ў этнамузычнай традыцыі беларусаў. Мінск, 2015. С. 151-153. № 62, 63.

Т.Б. А яшчэ якія гульні гулялі, акрамя «Цярэшкі»?
В.С. Якія гульні... Даўней карагоды ж гулялі. Гэта не на каляды, перад калядмі ў пост.
Т.Б. А раскажыце!
В.С. Вот у калядны пост танцаў ні было, толька карагоды. Гэта даўней.
Т.Б. Якія вадзілі карагоды?
В.С. А дак во гэта ні пры мне тожа вадзілі, не, ўжо як пры мне дык ні было гэтых. Так, зберыцца маладзёж. А гэта... а так ні вадзілі карагоды.
Т.Б. А пра Яшчура, Яшчур?..
В.С. (смяецца, спявае):



В.С. Вот і вся гэта песня.
Т.Б. Скажыце, Яшчура сажалі пасерадзіне?

В.С. Пасерадзіне.
Т.Б. А вакруг яго ўсе хадзілі…
В.С Ўсе хадзілі, за рукі пабраўшыся, і пелі.
Т.Б. А што патом, што рабіў Яшчур гэты?
В.С. Яшчар, мусіць, сабе хватаў дзеўку якую?! Во гэдак нешта. Вот пры мне сла-аба ўжо гулялі. Рабяты мы толька пробавалі...
Т.Б. А не было такога, што ён забіраў фанты якія ў дзяўчат, а яны далжны былі плакаць і прасіць «Яшчур, мой панок, аддай мой вянок»? Не было такога?
В.С. Ціху, вот... ВОТ! «Яшчар-паночык, аддай вяночык»
Т.Б. А якая там мелодыя была? Як спявалі?
В.С. Ну гэта самае можа?..
Т.Б. А спойце яшчэ далей – «Яшчар-паночак…»
В.С. А можа ішчо што было? Вот як Вы ўспомнілі, дык і я прыпамінаюся. Можа хустку хватаў ён?..

4. Яшчар, паночык, аддай вяночык (працяг карагода-гульні «Яшчар»)



5. А бацюшка Ягорей («Ягорье»)

Зап. экспедиция БГК (рук. Т. С. Якименко) в 1977 г. в д. Лялевщина Городокского р-на Витебской обл. от гурта в составе: Могучая Евдокия Семеновна (1906), Зуева Нина Ивановна (1917), Марченко Ольга Ефимовна (1908), Коновалова Христина Ефимовна (1899).

Опубликовано: Каляндарна-песенная традыцыя паўночнабеларускага рэгіёну ў экспедыцыйна-палявых запісах Т.С.Якіменка [Электронны рэсурс] / склад. Т. Бярковіч, Т. Канстанцінава, В. Прыбылова. Мінск, 2016. CD 1. № 34.



А бацюшка Ягорей![1]
Папасі нашых каровык,
Вісялі нашых галовык.
А я, мыладзенька, рож тапчу,
Траўку-мураўку вытыпчу,
Зялёныя жытца вырышчу.

[1] Второе полустишие повторяется дважды.

6. Чырвонэя роза («купалінка»)

Зап. экспедиция БГК (рук. Т. С. Якименко) в 1977 г. в д. Хмельник Городокского р-на Витебской обл. от Кордецкой Тамары Антоновны (1924).

Опубликовано: Каляндарна-песенная традыцыя паўночнабеларускага рэгіёну ў экспедыцыйна-палявых запісах Т.С.Якіменка [Электронны рэсурс] / склад. Т. Бярковіч, Т. Канстанцінава, В. Прыбылова. Мінск, 2016. CD 2. № 8.



Чырвонэя роза,[2]
Ня стой лі дарогі.
Хто йдзе, тот ламаець.
Чырвоную розу ніхто не брасают.
А дзеўкі йдуць – ламаюць,
Мальцы йдуць – ламаюць,
Бабы йдуць – ламаюць,
Дзяды йдуць – ламаюць.
Дзеўкым – ны вяночкі,
Мальцым – ны бралёчкі,
Бабым – ны юрочкі,
Дзідам – ны кіёчкі.

[2] Кождая строка повторяется.

7. Пара ў двору – ні ранінька («жнівеньская», баллада)

Зап. Т. Л. Константинова, В. М. Прибылова, Т. Л. Беркович в 2014 г. в д. Волковичи Чаусского р-на Могилёвской обл. от Отдельной Любови Савельевны (1929, д. Дубровка Могилёвского р-на).

Опубликовано: Этнамузычная традыцыя ўсходнебеларускага рэгіёну: Чавушчына [Электронны рэсурс] / склад. Т. Бярковіч, Т. Канстанцінава, В. Прыбылова. Мінск, 2016. CD 1. № 36.



Пара ў двору – ні раненька.[3] У!
А ўжо й расіца халодная.
Мяне ж мамачка няродная
У вароціках сустрюкая,
Па вадзіцу пасылая,
Па вадзіцу ды ў крыніцу,
Ды з новымі вядзерцамі,
Ды з дубовым каромислам.
Станьця вы, вёдры, камянём,
Пачобачкі – вербою,
А я, маладая, травою.

---

[3] Каждая строка повторяется.

8. Дзевачкі, кругым, кругым («карагод на свадьбу, як доруць»)

Зап. Т. Л. Константинова, В. М. Прыбилова, Т. Л. Беркович в 2014 г. в д. Петуховка Чаусского р-на Могилёвской обл. от Аверьяновой Надежды Исаковны (1937).

Опубликовано: Этнамузычная традыцыя ўсходнебеларускага рэгіёну: Чавушчына [Электронны рэсурс] / склад. Т. Бярковіч, Т. Канстанцінава, В. Прыбылова. Мінск, 2016. CD 2. № 8



Дзевачкі, кругым, кругым
Ны зялёным лугым.[4]

Дзевычкі, ідзеця,
Золыта ні ўраніця.

Золыта ні ўраніця,
Серебра не рассыпця.

Мой бацька нібыгатый,
Золыта не прісыплець,
Серебра не прікупіць.

---

4 В строфах 1-3 вторая строка повторяется.